DLA MAŁYCH DZIETAK

ДЛЯ МАЛЫХ ДЗЕТАК

J. H.

DLA MAŁYCH DZIETAK

DZICIAČY FALKLOR

ДЛЯ МАЛЫХ ДЗЕТАК

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛЁР

Vyd. Zaranka

New York — 1965

УСТУП

Нарадзілася ў сялянскай хаце дзіцянё. Калі хрэсьбіны адтупалі, дык сям'я пераходзе да абыдзённага жыцьця, але клопаты аб маладзёнку прадаўжаюцца. Праз тры-чатыры тыдні яму вешаюць калыску, ды адно перад другім стараюцца калыхаць яго: матка, бабулька ды старэйшыя сястрыцы й браткі. А пры калыханьні кожнае зь іх пасвойму напявае калыханку. І вось пад гукі ціхай і павольнай калыханкі ў дзіцяці ўзьнікаюць першыя чалавечыя пачуцьці. Слоўны зьмест гэтых калыханак просты. Мэлёдыя спакойная, павольная, усьпляючая. У калыханках успамінаецца імя самога дзіцяці дый жывёла, якая яго акалае: курка, каток, мышка.

Калі дзіця пакідае калыску, дык над ім апякуюцца, або бабулька, або старэйшыя сястрыцы ці браткі. Яны прывучаюць дзіця да гульняў, якія зьвязаны з пытаньнямі й адказамі, зь дзіцячымі звычаямі-прыказамі ды зь дзіцячымі вершыкамі-песенькамі, якія дзеці любяць гаварыць нарасьпеў.

Дзеці сямі-васьмі й далейшых гадоў любяць рухлівыя гульні, а часам і са сьпевамі. Гэтага-ж веку дзеці цікавяцца казкамі й загадкамі. Асабліва дзеці любяць рымаваную мову. Вось якраз усяго гэтага ў гэтым зборніку патроху можна знайсьці.

DARAŽEŃKIJA DZIETKI!

Dla vas, dzietki, napisana heta knižačka. Jana maleńkaja, ale stareńkaja, bo hetyja piesieńki, vieršyki, kazački, hulni dy zahadki źjavilisia na śviet vielmi, vielmi daŭna. Jim budzie kolki sotak hadoŭ, a jinšym moža j kala tysiačy. Našy praščury dbali ab svajich dzietkach, rupilisia, kab jany nia tolki byli nakormleny j dahledžany, ale kab viesieła j razumna pravodzili volny čas. Jany dla svajich dzietak paŭkładali hetyja piesieńki, vieršyki, kazački, zahadki dy hulni. A jichnyja dzietki pieli piesieńki, havaryli naraśpieŭ vieršyki, apaviadali adzin adnamu kazački, zahadvali zahadki dy hramadkaj hulali ŭ roznyja hulni. Jim było viesieła.

Hetyja piesieńki, vieršyki, kazki, zahadki dy hulni pieradavalisia z pakaleńnia ŭ pakaleńnia dy dajšli až da našych časoŭ. Voś usio toje, što zachavałasia ŭ pamiaci starejšych, jany pieradajuć vam, dzietki, u vyhladzie hetaj knižački.

KAŁYCHANKI

1



Luli, luli, luli!
Prylacieli kury,
Sieli na varotach,
U čyrvonych botach.
Stali sakataci,
Što kuračkam daci:
Ci žyta karyta?
Ci jačmieniu žmieniu?
Ci harochu trochu?
Ci bobu karobu?
Treba daci hrečki,
Kab nieśli jaječki.

2

Luli, luli, luli!
Prylacieli kury.
Sieli na varotach,
U čyrvonych botach.
Stali sakataci,

Što dziciaci daci:
Kania varanoha,
Byka paławoha,
Ciałušku-dravušku
I švinku kryksušku,
Aviečku-blajušku,
J kurku-sakatušku.
I hetaha mała,
Treba kusok sała.

3

Luli, luli, luli!
Prylacieli kury.
A kury na jušku,
Pierja na padušku.

4

Luli, luli, luli!
Palez kot pa duli.
Pamaroziŭ łapki,
Palez na pałatki.
Stali łapki hrecca,
Niehdzia katku dziecca.
Palez-by dałoŭki,
Bajicca karoŭki.
Palez-by jon vyšaj,
Dyk bajicca myšaŭ.
Tam myški dureli,
Katku chvost adjeli.
Z pałatak zvaliŭsia
Dy na śmierć zabiŭsia.

5

Chadziŭ katok u lasok,
Znašoŭ katok pajasok,
Usim jaho pradavaŭ,
A Hanulcy darma daŭ.

6

Pašoŭ katok na taržok
Kupiŭ katok piražok.
Sam piražka ukusiŭ
Dy dziciaci pałažyŭ.

7

Pašoŭ katok u lasok
Pa Marylčyn pajasok.
Pajasočka nie znašoŭ,
Sam da domu nia pryšoŭ.

8

Cybulica horka,
A Marylka zorka.
Lulaj, lulaj dzietki spać,
Katok budzie kałychać.

9

A ty katok sivy,
Prosim ciabie ŭ sieni!
A ty katok strakaty,
Prosim ciabie da chaty,
Budzieš u nas načavać
Mikałajku kałychać.

10

Luli, luli katočak!
Zlizaŭ babčyn miadočak.
Sama babka źlizała
Dy na katka skazała.
Katok babki zbajaŭsia,
Pad prypiečak schavaŭsia.
Babka katka znašła,
Za vuška patrasła.
Pašoŭ katok płačučy,
Za jim babka skačučy.

11

Luli, luli, lulaju!
Ja katočka nałaju,
Kab ty katok nie chadziŭ,
Kab nam Janki nia budziŭ.
A ty kocie, von, von!
A na Janku son, son!

12

Luli, luli, voŭk jidzie!
Majho Janku ukradzie.
A ty voŭča pašoŭ von,
A na Janku majho son!

13

Luli, luli, lulasieńki!
Było ŭ matki try Jasieńki:
Adzin koni pasie,
Druhi jeści niasie,
Treci siadzić na kamieni,
Dziaržyć dudu na remini.
Aj, ty dudka maja!
Viesiałuška była.
Viesialiła mianie
Na čužoj staranie.
Jak paviesiŭ ja dudu
Na zialonym dubu.
Niachaj viecier paviavaje,
Niachaj duda sama jhraje.
Duda z dubu zvaliłasia
Na tresački pabiłasia.

DZICIAČYJA ZVYČAJI-PRYKAZY

14

Kali maci vymaje dzicia z vady paśla kupańnia, dyk prykazvaje, a za jej paŭtaraje j dzicia:

Vadzica ŭ mora,
A dziciatka ŭ horu.

Kali ŭ dziciaci vyryvajecca dziciačy (małočny) zub, dyk jano kidaje hety zub na pieč u kutok dy pramaŭlaje:

Myška, myška!
Na tabie zub kaściany,
A daj mnie zialezny.

16

Jość čyrvonieńkaja kuzuračka z čornymi kropielkami Jaje dzieci nazyvajuć "Andrejka". Kali dzieci ŭbačać Andrejku na bylincy travy, dyk pramaŭlajuć:

Andrejka-jahodka,
Ci budzie zaŭtra pahodka?
Kali budzie — padymisia,
A nia budzie — apuścisia.

Kali Andrejka padymiecca, palacić, dyk dzieci vierać, što zaŭtra budzie pahoda; a kali jon apuścicca na doł, jany peŭny, što zaŭtra budzie doždž.

17

Kali žuravy latuć u vyraj ci z vyraju, dyk dzieci, kab źbić žuravoŭ z jichnaj darohi, pačynajuć krucicca dy kulacca j pry hetym pramaŭlać:

Kruciciesia žuravy
Kala majej haławy!

žuravy pačynajuć krucicca. Ale najbolej dzieci, ubačyŭšy žuravoŭ, prykazvajuć:

Prosta daroha da Boha!
Prosta daroha da Boha!

18

Kali dzieci viasnoj u haji pieršy raz znajduć krasku pralesku, abo kali niechta jim pryniasie z haju hetyja kraski, dyk jany prykładajuć hetyja praleski da vačej, abo truć jimi vočy dy pramaŭlajuć:

Budźcie vočki, jak praleski!
Budźcie vočki, jak praleski!

19

HUKAPIERAJMAŃNIE VYĆCIA VAŬKA

Kali dzieci pačujuć vyćcio vaŭka, dyk jany heta vyćcio pierakładajuć na słovy:

Avu-u-u-u-u! Avu-avu-avu!
A dzietački pamru, pamru!
A chto-ž mianie pachavaje?

A vaŭkovy dzieci, siedziačy ŭ łomie, adkazvajuć:

Vu-vu-vu-vu-vu-vu-vu-vu
My, my, my, my, my, my, my, my!

20

Hetak prykazvajuć chłapčuki, kali hulajuć z sabakam:

Ciu-ciu-ciu-ciu-ciu-ciu!
Prasiŭ voŭk na kućciu!

DZICIACYJA HULNI PRY UDZIELE STAREJSYCH

21

Niechta sa starejšych złoža dva palcy, jak kazinyja rohi, badzie jimi dzicia dy pramaŭlaje:

Jidzie kaza rahataja,
Zbadzie dzicia puzataje.
Bukiš! Bukiš! Bukiš!

22

Niechta sa starejšych źlohka skrabučy pa dałoni dzicia, pramaŭlaje:

Biažyć myška pa palicy,
Biažyć myška da krynicy,
Da ściudzionieńkaj vadzicy.
Tut pień. (Ściskaje ručku vyšej dałani).
Tut kałoda. (Ściskaje ruku za ceŭku).
Tut krynica. (Kładzie ruku dziciaci na plačo).
Tut ściudzionieńkaja vadzica. (Ščakoča dziciaci pad pachaj. Dzicia śmiajecca)

23

Niechta sa starejšych kładzie dziciaci ruku na hałavu dy źlohku krucie hałavu naŭkoła, pramaŭlajučy:

Magała[1]), magała!
Pa dalinie skakała,
Drobny mačok źbirała,

Małym dzietkam davała.
Sušała[2]) maŭčała.
Pliski dy liski.
Ci hruk? Ci kačan?
Kali "Hruk",
Dyk pajdzi z majich ruk!
Kali "Kačan",
Dyk ja ŭznoŭ pačaŭ!

Kali dzicia adkazała "Hruk!" dyk hulnia kančajecca, kali "Kačan!" dyk heta samaja hulnia pačynajecca z pačatku.

24

Niańka ci babulka bje ŭ ładki dy pramaŭlaje, dzicia hetaksama bje ŭ ładki dy paŭtaraje:

Ładu, ładu, ładki!
Pajeŭ kot aładki,
Pšonnyja, jačnyja,
Jany byli smačnyja.
Aržanyja pałavyja,
Babovyja hatovyja.

25

Niańka ci babulka hładzie dzicia pa hałoŭcy, zadaje jamu pytańni j dapamahaje adkazvać:

— Łasačka, łasačka dzie była?
— U Boha!
— Sto rabiła?
— Chatku miała!
— Sto zarabiła?
— Piražok!

— Dzie ty dzieła?
— Sama źjeła!
— A chto krošački paźbiraŭ?
— Myška!

26

Niańka ci babulka dzioŭbaje sahnionym palcam pa stale, jak varona ci saroka, zadaje dziciaci pytańni j dapamahaje jamu adkazvać:

Ga-ga! Varona!
Ga-ga! Saroka!
— Dzie ty była daloka?
— Była ŭ pana na taku!
— Što rabiła?
— Tałaku!
— Što zarabiła?
— Kusok sała!
— Dzie ty dzieła?
— Sama źjeła!

27

Apaviadaje niańka ci babulka. Dzicia słuchaje, navučajecca a potym i samo havora:

Čy-čy! — saroka.
Prylacieła zdaloku.
Na prypiečku siadzieła.
Dzieciam kašu varyła,
Apałonikam miašała,
Spytavać davała.

Hetamu dam i hetamu dam,
A henamu nia dam,
Bo jon hultaj:
Krup nia draŭ,
Vady nie nasiŭ,
U piečy nie paliŭ,
Kašy nie varyŭ.
Jamu łyžka na palicy,
Jamu kaška ŭ čarapicy.

VIERŠYKI-PIESIEŃKI.

28



Ku - ju, ku - ju nož - ku. pa -je- du ŭ da - rož - ku.

Kuju, kuju nožku!
Pajedu ŭ darožku.
Zaprahu cialežki,
Pajedu ŭ hareški.
Darožka kryvaja,
Kabyłka chramaja.
Kulik, kulik, kulik!

Dziedzia koni pasie
I hareški trasie.
Dzied hareškaŭ natros,
Małym dzietkam pryvioz.

29

Pasiejaŭ ja repku
Ni husta, ni redka.
A pryšoŭ ja zrana,
Maja repka rvana.
A pryšoŭ ja z paŭnačy,
U majoj repcy paničy.

30

Pani syna radziła,
Na koniku sadziła.
Cyla! kosia, da vady.
Saŭkovyja pavady.
Konik nie nahnuŭsia,
Synok ulaknuŭsia.
Konik nie napiŭsia,
A synok zvaliŭsia.

31

Pany sieli jeści,
Mianie prosiać sieści.
Ja za stoł, za piroh
Mianie załab, za paroh.
Ja za paroh płačučy,
Pany za mnoj skačučy.

32

Chto nia ŭmieje araci,
Tamu jeści nia daci,

Nia dać chleba ni baćvińnia,
Niachaj pasie hultaj śvińnia.

33

Łapciłki novyja,
Aborki mašynovyja.
Pajaskom padpirazaŭsia
I da statku škiravaŭsia.

34

Cilim-bom! Cilim-bom!
Zahareŭsia koščyn dom.
Lacić kuryca z viadrom,
Zalivaci koščyn dom.

35

Kali ŭ chłopcaŭ ad doŭhaj krutni naŭkoła zakrucicca hałava, dyk jany vyklikajuć:

A pjanicy łajdaki
Pahublali prasnaki.

36

Kali chłopcy pa pylnaj darozie biahuć na vypieradki, dyk vyklikajuć:

Pył dy dym, jak lacim.

37

Hukapierajmańnie zvonu zvanoŭ:

Dzyn-dzyłyn! Dajcie blin!
Choć hareły, aby cełу!

38

Hukapierajmańnie jihry jiskrypki:

Ty-li-li! ty-li-li!
Kab poliŭki ulili,
I kab chleba dali,
Dyk-by pasiarbali.

39

Maju čaravički
Mały — nievialički.
Čaravički: — Tapu-tapu!
Bačka kaža: — Druhi kuplu. —
Maci kaža: — Trascu!
Laniłasia praści. —

40

Paskaču ja, paskaču
Majmu baćku bahaču
I mamačcy lubačcy,
Kałychała u lulačcy.

41

Nia viedała haspadyńka
Jak sabačku zavuć:
— Ciuciu, ciuciu! chadzi ŭ chatku,
Tabie jeściki daduć.

42

Kaza, kaza biełaja
Pa harodzie biehaje.
Prybiehła da tynu
I kryčyć što zhinu.

43

Cichu, Janačka,[3]) nia płač,
Mama śpiače chachłač,
Masłam pamaža
J tabie nie pakaža.

ŻARTAŬLIVYJA DADATKI

DA JIMIEŃNIAŬ

44

Adam, ja ciabie pradam.
Skuru złuplu
Dy druhoha kuplu.

45

Agata — łupata
Padpiečču siadzieła,
Na kury hladzieła,
Jak kury niesucca.
Jak dziuby trasucca.

46

Alaksiej, muku siej.
Mikałaj učyniaj.
Apanas — śvinnapas.
Cimoch schavaŭsia ŭ moch.

47

Anton-Charyton
Strašyŭ babu chamutom.
Pasadziŭ pad kutom
I zakryŭ chamutom.

48

Anton maładzieńki
Piŭ miod saładzieńki,
Prykaciŭsia k bočačca —
Jašče troški chočycca.

49

Janka-Bułanka
Z hary pakaciŭsia,
Piaskom udaviŭsia.

50

Jakub śvińniu askub.
Svińnia pad most,
A Jakub za chvost.

51

Uspaminaje Hanna
Svajo haravańnie:
Sama biažyć truškom,
Vadu niasie harškom.
Harščok razabjecca,
Vada raźlijecca,
A biednaja hałovačka
Biady nabiarecca.

52

Adna była Kaciaryna,
A druhaja Tekla.
Adna adnu zakiłzali
J pajechali ŭpiekła.

53

A Marjana, Marjana
Usiu repu parvała.
A Vasil hałasiŭ
Pakul repu panasiŭ.

54

Jišli Todar jiz Tadoraj,
Znašli łapać jiz aboraj.
A ty Todar, ja Tadora.
Tabie łapać, mnie abora.
Lažyć Todar na baku,
Kura lulku tabaku.

55

A Maciej-dabradziej
Paźbivaŭ byku rohi,
Pazałuplivaŭ nohi

56

Matavuš, Matavuš
Matajecca kala vuš.

ŽARTAŬLIVYJA KAZAČKI

Kali dzieci prośbaj naprykrajuć, kab jim kazali kazki, dyk jim (adčepnaha) kažuć karocieńkija žaraŭlivyja kazački:

57

Žyŭ dzied Tamaška.
Była ŭ jaho biełaja siarmiažka.
A pry boku łatačka.
Ci dobraja kazačka?

58

Žyŭ dzied z babaj,
Jeŭ chleb z papaj,
Strašyŭ babu łapaj.

59

Žyŭ dzied z babaj,
Jeŭ chleb z aŭsom,
Strašyŭ babu kaŭšom.

60

Karotkija vykazy z ciažkim vymaŭleńniem, ź jakimi dzieci lubiać praktykavacca.

Unučka, unučka
Zmani maniučku,
Aby było hładka.
Dam tabie aviečačku j jahniatka.

61

Tabakierka
Rastabakierčyłasia,
Vytabakierčyłasia.

62
Razadrałasia,
Razłapsardačyłasia,
Vyłapsardačyłasia.

63
Jišoŭ pop kala kop.
A kapa kala papa.
A čyrvonaja nitka
Kala kapialuša.

PIEŚNI J HULNI

64 KAZIOŁ



Žyŭ u babki
Sivieńki koźle.
Lida, lida, lidada!
Sivieńki koźle.

Jon na stajency stajaŭ
Jon apolinki smaktaŭ.
Lida, lida, lidada!
Jon apolinki smaktaŭ.
Dy pašoŭ toj kazioł
U les pahulaci. (Lida...)
Dy pa jelničku,
Pa biareźničku. (Lida...)
Adzin vaŭčok
Ablezły bačok. (Lida...)
Siem hod lažaŭ,
Kaźlinki žadaŭ. (Lida...)
— Pastoj, koźle,
Pabarokajemsia. (Lida...)
Dy jak voźmie za rožki,
Dy jak kinie ab doški. (Lida...)
Jak voźmie za chvastok,
Dy jak kinie ab mastok. (Lida...)
Pryšli k babcy
Smutnyja vieści: (Lida...)
— Ustavaj babka,
Dy pali piečku. (Lida...)
Dy vary kašku,
Paminaj kazła. (Lida...)
— Ci nia koźle byŭ?
Ci nia sivieńki? (Lida...)
Jon i droŭcy vaziŭ,
Jon i piečku paliŭ. (Lida...)
Jon vadzicu nasiŭ,
Jon i kašku varyŭ.
Lida, lida, lidada!
Jon i kašku varyŭ.

65 REDŹKA

(Dziejnyja asoby: hramada dziaciej, haspadynia j pan).

Dzieci siadziać u radočak, jak redźka na hradach. Kala jich stajić haspadynia. Pan vyhodzie za dźviery ci adychodzicca.

Pan: Stuk-po-stuk! (ci stukaje ŭ dźviery).

Haspadynia: A chto tam?

Pan: Ja, sam pan!

Haspadynia: A čaho?

Pan: Pa redźku!

Haspadynia: A našto?

Pan: Pryjechała pani ź viasella,
Zažadała redźki z pachmella.

Haspadynia: Rvi z kanca!
Nie zaryvaj karanca!
Na majim poli atrasaj!
Varoty začyniaj,
Kab dziakavy śvińnia
Nia ŭleźli ŭ baćvińnia!

Pan biare spačatku hradki adnu redźku. Aściarožna padymaje jaje pad ruki, strasaje, dy viadzie jaje za dźviery. Potym hetkim paradkam, jak i pierš stukaje, a haspadynia pytaje: "Chto tam?" I hetak paŭtarajecca pakul pan nia vyrvie ŭsiej redźki.

66 PASTUŠOK I AVIEČKI

(*Dziejnyja asoby:* aviečki hramada dziaciej, pastušok i voŭk).

Usie aviečki (dzieci) stajać u kutku. Vaŭka nia vidać. Pastušok chodzie z kijem kala aviečak. Razmachvaje kijem i piaje:

Pasu, pasu aviečački
Ja za haroju,
Voŭk za druhoju.
A ja vaŭka nie bajusia,
Kijem baraniusia.
A ja vaŭka nie bajusia,
Kijem baraniusia!

U časie pastuškovaha śpievu voŭk padcikaŭsia, schapiŭ aviečku j pavioŭ, a pastušok nie zaŭvažyŭ. Potym pastušok ahledziŭsia, što niama jahonaj adnej aviečački:

— Abo! Heta-ž niama majej bielańkaj aviečački. Pajdu jaje šukać .—

Pastušok pryhladajecca na doł, pakazvaje, stukajučy kijočkam pa padłozie, i pramaŭlaje:

— Voŭča śled, aviačča śled! Voŭča śled, aviačča śled... — Dy hetak stukajučy kijočkam ab padłohu, spatykaje vaŭka j pytaje ŭ jaho:

— Kumok, kumok! ci nia bačyŭ ty majej bieleńkaj aviečački? —

— A pabiehła bieleńkaj darožkaj! — adkazvaje voŭk.

Pastušok varočajecca da svajich aviečak dy, machajučy svajim kijem, znoŭ piaje svaju pieś-

niu. A ŭ hety čas voŭk padkradajecca dy kradzie čornieńkaha barančyka, a pastušok nie zaŭvažaje. A narešcie ahledziŭsia:

— Abo! heta-ž niama majho čornieńkaha barančyka. Pajdu jaho šukać. —

Pastušok, stukajučy kijem pa padłozie, pakazvajučy ślady, jidzie ŭ toj bok, kudy voŭk pavioŭ barana j pramaŭlaje:

— Voŭča śled, barańnie śled. Voŭča śled, barańnie śled... A kali spatkaŭ vaŭka, dyk jiznoŭ pytaje:

— Kumok, kumok! ci nia bačyŭ ty majho čornieńkaha barančyka?

— A pabieh čornieńkaj darožkaj, — adkazvaje voŭk.

Pastušok varočajecca da svajich aviečak dy piaje svaju pieśniu, a voŭk jidzie kraści treciuju aviečku. Hetak paŭtarajecca pakul voŭk nie pierakradzie ŭsich aviečak.

Kali voŭk ukradzie apošniuju aviečku dy kali pastušok pytajecca ŭ vaŭka: "Kumok, kumok! ci nia bačyŭ ty majej sivieńkaj aviečački?" a voŭk adkaža: "A pabiehła sivieńkaj darožkaj". — Tady ŭsie kradzienyja aviečki, jakija stajać u vaŭkovym kutku, raptam zablajuć:

— Bia! Bia! Bia! Bia! ... ...

Pastušok namiarajecca na vaŭka kijem. Voŭk uciakaje. Pastušok zajmaje svaje aviečki dy honie damoŭ, piajučy svaju pieśniu. Hulnia kančajecca.

Uvaha: Pry hulni dziaŭčat zavuć — aviečka,

a chłopca zavuć — baran. Kolery dadajuć abo pa koleru vopratki, abo pa koleru vałasoŭ.

67 VIERABIEJ

Dziejnyja asoby: stary vierabiej, baba i vierabji (hramada dziaciej).

Baba stanovicca trochi voddal ad hramady dziaciej. Z hramady vierabjoŭ (dziaciej) vychodzie stary vierabiej dy pačynaje skakać i pieć:

Paskakaŭ vierabiej dy pa śmietničku.
Jon źbiraŭ dy sklikaŭ ŭsiu siamiejačku:
— Mała nas, mała nas na piečy na chlebie!
Jašče nam, jašče nam Marylačku treba!

Pry hetym stary vierabiej padchvatvaje da siabie "Marylačku" dy ŭ dvajich skačuć i piajuć. Heta pieśnia paŭtarajecca j za kožnym razam Stary Vierabiej padchvatvaje pa čarzie jinšych dzieciej (Mikałajku, Antošku, Pruzynku, Aŭdulku) pakul źbiare ŭ koła ŭsich vierabjoŭ. A sabranyja ŭsie vierabji ŭ koła piajuć:

Skača, skača vierabiej,
Paźbiraŭ svajich dziaciej.

Pačynaje pieć Baba, a vierabji pamahajuć:

Skačy, skačy vierabiej,
Nia ruš majich kanapiel,
Bo ja tabie, vierabju,
Kijem nahu pierabju,
A na tuju nožku
Nadzienu pančošku.

Skačučy j piajučy, vierabji abkružajuć Babu dy vierabji j Baba dalej piajuć:

Nalacieli vierabji
Na babiny kanapli!
Skača, skača vierabiej,
Paźbiraŭ svajich dziaciej!
Skačy, skačy vierabiej,
Nia ruš majich kanapiel!
Bo ja tabie vierabju
Kijem naho pierabju,
A na tuju nožku
Nadzienu pančošku.

Kali dzieci naskačucca j napiajucca, dyk hulnia kančajecca.

68 JAŠČAR

Jaščar siadzić na piańku ŭchutany ŭ zieleni. Dziaŭčaty ŭ viankoch na hałavie, uziaŭšysia za ruki, to padychodziać, to adychodziać ad Jaščara, piajuć:



Siadzi, siadzi Jaščar! Hej nam hej!
U załatym kreśle. Hej nam hej!
U laskovym kuście. Hej nam hej!
Harešyki trušča. Hej nam hej!
Biary sabie pannu. Hej nam hej!
Katoruju chočaš. Hej nam hej!

Ci što ŭ čaravičkach. Hej nam hej!
Ci što ŭ pančoškach. Hej nam hej!
Ci — choraša chodzie. Hej nam hej!
Ci — rabotku robie. Hej nam hej!

Kali dziaŭčaty ŭ časie hulni padychodziać da Jaščara, dyk jon pa čarzie ŭ kožnaj dziaŭčyny źnimaje vianok z hałavy. Spievy datul pradaŭžajucca, pakul Jaščar paźnimaje ŭsie vianki. Pośle hetaha dziaŭčaty pa adnej padychodziać da Jaščara vyprašavać svoj vianok sławami:

Jaščar, panok,
Addaj vianok.
Ja ručki, nožki mazaliła,
Svajho vianočka nie znasiła.

Pry hetym Jaščar starajecca raśsmiešyć dziaŭčynu. Kali pry prośbie vianka dziaŭčyna zaśmiajecca, dyk Jaščar nie addaść vianka. Jana adychodzicca biez vianka. Jana padychodzie druhi raz prasić vianka. Jaščar tolki tady addaść jej vianok, kali jana pry prośbie vianka nie zaśmiajecca.

69 PIEVIEŃ

Skača pievień kulhavy
Ad prypiečku da ławy.
Kukareku, piavunok!
Niama chleba na razok.
Adna była skarynačka,
J tuju źjeła Marynačka.

A dzie taja Maryna?
Kałoda zabiła.
A dzie taja kałoda?
Červi patačyli.
A dzie tyja červi?
Kury pdziaŭbali.
A dzie tyja kury?
Jastraby padrali.
A dzie tyja jastraby?
Stralcy pastralali.
A dzie tyja stralcy?
Pajechali na vajnu.
Pajechali na vajnu
Baranici staranu.

70 ЗВОН

Дзеці бяруцца за рукі ды становяцца ў кола. Адно спрытнейшае становіцца ў коле (сэрца звона). Яно ходзе ў звоне наўкола. Кожнаму кладзе руку на плячо ды пытае: „Які звон?" Звычайна адказваюць: „Мядзяны". А бывае адказваюць: „Залаты". „Срыбны". „Зялезны". Калі ўсіх перапытае, тады бегае поперак круга, пры гэтым гамоніць: „Бом! Бом! Бом!" ды ўдараецца ў рукі, каб разарваць іх ды ўцячы. Гульцы моцна трымаюцца за рукі, каб яго ня выпусьціць. Нарэшце, калі ён разарве рукі, дык ўцякае. Усе ўдзельнікі гульні кідаюць круг ды даганяюць яго. Хто яго злове, дык наступны раз той становіцца ў сярэдзіну круга за сэрца звона. Гульня працягваецца пакуль ня збрыдае.

71 ПРАСНАКІ ЛАМАЦЬ

Удзельнікі гульні адно да аднога становяцца плачыма. Адно за аднога чапляюцца локцямі рук. Па чарзе то адно то другое згінаюцца. Калі адно згінаецца, дык другое ў яго на плячах выгінаецца сярэдзінай. І нэтак часта чаргуюцца. Ня можна нізка згінацца, каб другое праз галаву не звалілася далоў.

72 КРУПЫ ДРАЦЬ

Двое ўдзельнікаў моцна трымаюцца за рукі, сагнёнымі ўсіма пальцамі, пры выцягненых руках. Адкідаюцца назад галовы й плечы. Нагамі ўпіраюцца ў ногі й шпарка круцяцца наўкола на месцы.

73 БОР ДРАЦЬ

Два хлопцы надзяюць на плечы моцныя шлейкі, зьвязаныя моцнай і доўгай вяроўкай. Абодва хлопцы нагамі ўпіраюцца ў зямлю, а рукамі хапаюцца за траву, куп'е ці кусточкі. Каторы за сабой пацягне другога — за тым і перамога.

74 КАТЫ ПАСЬЦІЦЬ

Два хлопцы (каты) накладаюць праз плечы моцныя шлейкі, зьвязаныя моцнай і доўгай вяроўкай. Трэці хлопец (пастух) становіцца пасярод іх на роўнай адлегласьці. Ён сярэдзіну гэтай вяроўкі накладае сабе на карк, а канцы спускае на дол ды перакладае іх між ног і нароўні каленяў трымае іх рукамі, адкуль яны разыходзяцца ў розныя бакі да кожнага ката. Пастух трымае ў руках абодва

канцы вяроўкі й пугу. Калі-б пастух выпусьціў вяроўку з рук, дык каты цягнучы ў розныя бакі разшырылі-б ягоныя ногі маглі-б яго абваліць і сагнуць у крук. Каты ўпіраюцца нагамі ў зямлю, а рукамі хапаюцца за траву й кусьцікі. Пастух мае права ката ўдарыць пугай, калі дастане. Але ягоная пуга кароткая. Ён мусе ката падцягнуць да сябе за вяроўку. Калі пастух аднаго ката будзе падцягваць да сябе, дык другі кот ў гэты час будзе пастуха цягнуць да сябе. Абодва каты мусяць быць пільнымі, каб бараніць адзін аднаго ад пастуха.

KAZKI

75 DUDU, DUDU, DUDU.

Dudu, dudu, dudu!
Pradaŭ dzied baradu.
Kupiŭ sabie kasu
Dy vyšaŭ na rasu.
Našto jamu kasa?
Kab sianco kasici.
Našto toje sianco?
Karovak karmici.
A našto tyja karoŭki?
Kab małačko davali.
A našto toje małačko?
Syrčyki rabici.
A našto tyja syrčyki?
Pastuška karmici.
A našto toj pastušok?

Kab śvinački paściŭ.
A našto tyja śvinački?
Kab hory kapali.
A što ŭ tych horach?
Dziežačka załataja.
A što ŭ tej dziežaččy?
Misačka załataja.
A što ŭ tej misaččy?
Ziarniatki załatyja.
A dzie tyja ziarniatki?
Jich pievień padziaŭbaŭ.
A dzie toj pievień?
Za mora palacieŭ.
A dzie toja mora?
Kraskami zarasło.
A dzie tyja kraski?
Jich dzieŭki paščypali.
A dze tyja dzieŭki?
Dziaciuki pabrali.
A dzie tyja dziaciuki?
Dziadami stali.
Dudu, dudu, dudu!
Kupiŭ dzied baradu.

76 ВЕРАБЕЙКА

Верабейка сеў на былінку ды кажа:
— Былінка, былінка, калышы верабейку!
— Не хачу, ня буду верабейкі калыхаці! — кажа былінка.

— Каза, каза, ідзі былінку грызьці!
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду былінкі грызьці! — кажа каза.

— Воўк, воўк, ідзі казу есьці!
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду казы есьці! — кажа воўк.

— Стралец, стралец, ідзі ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду ваўка страляці, — кажа стралец.

— Вяроўка, вяроўка, ідзі стральца вязаці!
Стралець ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду стральца вязаці! — кажа вяроўка.

— Агонь, агонь, ідзі вяроўку паліці!
Вяроўка ня хоча стральца вязаці.
Стралец ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.

Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.

— Не хачу, ня буду вяроўкі паліці ! — кажа агонь.

— Вада, вада, ідзі агонь гасіці!
Агонь ня хоча вяроўкі паліці.
Вяроўка ня хоча стральца вязаці.
Стралец ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду агню гасіці! — кажа вада.

— Вол, вол, ідзі ваду піці!
Вада ня хоча агню гасіці.
Агонь ня хоча вяроўкі паліці.
Вяроўка ня хоча стральца вязаці.
Стралец ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду вады піці! — кажа вол.

— Доўбня, доўбня, ідзі вала біці!
Вол ня хоча вады піці.
Вада ня хоча агню гасіці.
Агонь ня хоча вяроўкі раліці.
Вяроўка ня хоча стральца вязаці.
Стралец ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.

Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Не хачу, ня буду вала біці! — кажа доўбня.

— Чэрві, чэрві, ідзіце доўбню тачыці!
Доўбня ня хоча вала біці.
Вол ня хоча вады піці.
Вада ня хоча агню гасіці.
Агонь ня хоча вяроўкі паліці.
Вяроўка ня хоча стральца вязаці.
Стралец ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Ня хочам, ня будзем доўбні тачыці! — кажуць чэрві.

— Куры, куры, ідзіце чарвей дзяўбаці!
Чэрві ня хочуть доўбні тачыці.
Доўбня ня хоча вала біці.
Вол ня хоча вады піці.
Вада ня хоча агню гасіці.
Агонь ня хоча вяроўкі паліці.
Вяроўка ня хоча стральца вязаці.
Стралец ня хоча ваўка страляці.
Воўк ня хоча казы есьці.
Каза ня хоча былінкі грызьці.
Былінка ня хоча верабейкі калыхаці.
— Мы хочам, мы будзем чарвей дзяўбаці! — адказалі куры.

Куры пашлі чарвей дзяўбаці.
Чэрві пашлі доўбню тачыці.
Доўбня пашла вала біці.
Вол пашоў ваду піці.
Вада пашла агонь гасіці.
Агонь пашоў вяроўку паліці.
Вяроўка пашла стральца вязаці.
Стралец пашоў ваўка страляці.
Воўк пашоў казу есьці.
Каза пашла былінку грызьці.
Былінка стала верабейку калыхаці.

77 ВОЎК І ЛІСКА

Была зіма. Быў вялікі мароз. Ліска сядзела пад ломам, накрыўшыся сваім пухкім цёплым хвастом, і гралася. Тут каля яе праходзіў худы галодны воўк. Ён быў сагнуўшыся ў тры пагібелі, з падцягненым жыватом, і тросься як у трасцы.

— Што зьмерз, суседзе? — пытаецца ліска.

— Дай рады, суседачка, зуб-за-зуб не пападае. Ня ведаю ці прасноўдаюся да вясны, — адказаў дрыжачым голасам воўк.

— Зь цябе, суседзе, толькі сьмяяцца трэба, — кажа ліска.

— Табе, суседка, толькі жарты й сьмешкі ў галаве, а мне дух вон вылазе, — заўважае воўк.

— Зь цябе, суседзе, ня толькі сьмяяцца трэба, — кажа ліска, — але цябе яшчэ й біць трэба. Як-жа ты, сусед, гэтак апусьціўся? Цэлы свой век авечкі цягаеш, а без кажуха ходзіш. —

— Калі-ж я, суседка, ні з кушнерствам ні з кравецтвам не знаёмы, — правуецца воўк.

— Дзівак ты, суседзе, дый годзе! — кажа ліска. — Будучае лета ты да мяне насі авечкі, дык пабачыш, які табе да зімы кажух змайструю. Усе зьвяры будуць дзівіцца ды зайздраваць.

***

Настала лета. Воўк хапае авечкі ды носе да ліскі. Ліска ляжыць са сваімі дзецьмі ў нарэ ды аб'ядаецца тым мясам, што воўк прыносе.

Настала восень. Воўк прышоў да ліскі й пытае:

— А калі-ж, суседачка, будзе гатовы кажух? Ужо па начах замаразкі бываюць, стужа падыходзе. —

— Кажух амаль што ўжо гатовы, — кажа ліска, — А толькі трэба коньская скура на аблямоўку, бо ты будзеш па ламаччы лазіць, дык хутка падзярэш кажух. А я хачу яго зрабіць моцным, каб маей рабоце ганьбы ня было. —

— Дзе-ж узяць коньскую скуру, — бядуе воўк. — Ды каб я й задушыў каня, дык ці-ж я сходую яго прыцягнуць да тваей нары? —

— Ты, суседзе, і стары, але з розумам горай за малога, — кажа ліска. — Ты ня ведаеш, што ў цябе пад бокам робіцца. Тут зусім блізка ў дзяка за гумном кабыла навязана. Я тут буду прымушана дапамагчы. Пойдзем з табой ўдваіх. Прывядзем тую кабылу сюды ў лес ды ўгонім яе ў гэта балота ў рудаўку. А калі яна ўгрязьне, дык тады я зь ей ужо сама спраўлюся, бо ты з сваей воўчай натурай гатоў скуру папсаваць, калі станеш яе душыць. —

***

Ліска з ваўком пашлі па дзякаву кабылу. Яны

падпаўзьлі да куста, дзе быў убіты пастарнак. Ліска й шэпча ваўку:

— Я зьніму пятлю вяроўкі з пастарнака ды надзену табе на шыю. Ты пабяжыш гэтай дарожкай у лес ды за сабой будзеш весьці й кабылу. Я ззаду буду яе падганяць, махаючы сваім касматым хвастом. А калі мы яе завядзём у тое балота ў рудаўку, дык твая работа будзе скончана. Тады я сама зь ей спраўлюся. —

Яны гэтак і зрабілі. Ліска зьняла пятлю вяроўкі з пастарнака, ды надзела яе ваўку на шыю ды туга засмаргнула. Сама ліска выскачыла з-за куста ды замахала сваім касматым хвастом. Калі кабыла ўбачыла ліску ды ейны кудлаты хвост, дык спудзілася ды кінулася наўцякача. Вяроўка

яшчэ горай стала заціскацца ў ваўка на шыі. Кабыла бяжыць колькі мае сілы ды за сабой цягне й ваўка. Кабыла гэтага ваўка пудзіцца ды яшчэ мацней бяжыць. А калі воўк удараецца аб пні й каменьне, дык аж угору падлятае, а кабыла яшчэ болей пудзіцца ды яшчэ мацней бяжыць.

Кабыла прыцягнула няжывога ваўка на дзякаў панадворак. А ліска сьмяючыся пабегла да сваей нары.

78 ГАНУЛЬКА

На краі вялікай пушчы стаяла маленька хатка. У гэтай хатцы са сваімі бацькамі жыла Ганулька. Аднаго разу яна ўзяла кашалёк і пашла зьбіраць суніцы. Чым далей яна адыходзіла ад хаткі, тым лепшыя й буйнейшыя былі суніцы. Яна як пагналася за ягадамі, дык забылася, што далёка адышлася ад сваей хаткі. Калі ў яе быў ужо поўны кашалёк суніцаў, дык толькі тады яна апомнілася, што заблудзіла ды ня ведае ў які бок ісьці дамоў. Колькі яна ня гукала ня крычала, дык чула толькі рэху свайго голасу.

Яна маўчаком бяжыць і бяжыць ды думае, што нейкую сьцежку натрапе ў лесе, якой яна прыдзе да сваей хаткі. Але яна адыходзілася далей і далей у лясную глуш. Нарэшце стала ў кустах шарэць, дый зусім сьцямнела. Яна села пад елачку адпачыць дый заснула. Раніцай яна ачхнулася ды пашла сьцежкі шукаць да хаты. Яна прышла да нейкага балотца дый перайшла яго. Там быў густы ельнік. Ідзе яна ды ідзе гэтым ельнікам, аж бача перад сабой палянку. На гэтай палянцы рудзень-

кія шчаняткі дурэюць, качаюцца. Яна ўсьцешылася, бо думала, што там нейкае людзкое паселішча, калі шчаняткі бегаюць. Але калі гэтыя „шчаняткі" згледзілі яе, дык раптам пахаваліся. Яна прытёрлася да древа ды стаіць і думае. Раптам ні-адтуль-ні-адсюль падбягае да яе вялікі страшны воўк. Ганулька ні жывая, ні мяртвая стаіць пры дрэве. Гэты воўк накіроўваецца проста да яе.

Воўк бярэ Ганульку за плячо ды вядзе яе ў лес. Калі Ганулька ўпіраецца, ня йдзе, дык воўк падганяе яе сваім хвастом. Воўк прывёў Ганульку ў густы ельнік ды піргнуў яе ў яму пад вывараць. У гэтай яме было ваўчынае гняздо, і там сядзелі

тыя рудзенькія „шчаняткі" якіх яна бачыла на палянцы, а гэта былі ваўчаняты. Той вялікі страшны воўк, гульк! у тую яму ў гняздо, а гэта была ваўчыца. Яна лягла ў гнязьдзе й стала карміць дзяцей, потым стала гуляць зь імі. Ганулька сядзіць у гэтай яме прытуліўшыся ў куточку.

Другі стары воўк прынёс пацвынка. Воўк, ваўчыца й пястун сталі есьці гэтага пацвынка. А што засталася невялічкая костка зь мясам, дык ваўчыца кінула ў куток ямы Ганульцы. Але яна не ўзялася есьці гэтага мяса. Пасьля калі згаладалася й абылася з ваўкамі ў яме, дык стала пробаваць есьці й сырое мяса. Але гэта ежа для яе была надта працінай, бо яна была сырая, забруджаная й несалоная.

Ваўчыца ўкінула Ганульку да ваўчанятаў, каб яна забаўляла іх і гуляла зь імі. Ганулька некалькі разоў хацела ўцячы з гэтай ямы. Але калі толькі яна памкнецца вылазіць, дык пястун пачынае яе кусаць за рукі, а малыя ваўчаняты хватаюць зубамі за ногі.

Ганулька жыла ў ваўчынай яме болей за тры тыдні. Людзі зрабілі аблаву на ваўкоў. Асочнік асачыў ваўчынае гняздо. Ён з аднаго боку лесу паставіў паляўнічых са стрэльбамі, а з другога боку паставіў воступ з трубамі, званкамі й стрэльбамі. Воступ пачаў трубіць, званіць, страляць і крычэць. Застрашаныя ваўкі пабеглі ў той бок, дзе былі пахаваўшыся паляўнічыя са стрэльбамі, дык паляўнічыя пастралялі ваўкоў.

Людзі з воступу вельмі зьдзівіліся, калі знашлі ў ваўчынай яме маленькую дзяўчынку, якая была худзенькая толькі скура ды косьці ды брудная. Хутка гэта загадка была разгадана. Ейны бацька быў тут на аблаве й пазнаў сваю Ганульку. Як-жа былі рады бацька з маткай і Ганулька, калі бацька прынёс яе зь лесу дамоў.

79 КАЗА НЕДАРЭЗА

Жылі ў маленькай хатцы дзед з бабай. У іх было двое дзяцей — хлопец і дзяўчына. Жылі яны бедна й ня мелі ніякай жывёлы. Дзед згарусьціў тры ґрошы, пашоў на кірмаш ды купіў казу. На другі дзень дзед загадаў свайму сыну гнаць на пашу казу. Хлопец цэлы дзень пасьціў казу. А калі ён вечарам прагнаў дамоў яе, дык дзед вышаў на двор дый пытаецца ў казы:

— Козачка-рожачка, ці піла ты ці ела?
— Не, дзедзька-лябедзька, ні піла я ні ела!
Бегла праз кладачку, глынула вады капачку.
Бегла праз масток, ухапіла кляновы лісток!
Гэтым і жыла дзянёк! — адказала каза.

Дзед абсьцёбаў пугай хлапца й прагнаў яго з хаты.

На другі дзень дзед загадаў дзяўчыне гнаць на пашу казу. Яна цэлы дзень пільна стаяла ля казы. Рвала й падносіла ей маладзенькую травіцу, ганяла паіць да крыніцы. А калі вечарам прагнала дамоў, дык дзед вышаў на двор і пытае казу:

— Козачка-рожачка, ці піла ты ці ела?
— Не, дзедзька-лябедзька, ні піла я ні ела!
Бегла праз кладачку, глынула вады капачку!

Бегла праз масток, ухапіла кляновы лісток!
Гэтым і жыла дзянёк! — адказала каза.

Дзед абсьцёбаў дзяўчыну розґай і прагнаў з хаты.

На чацьверты дзень дзед загадаў бабе гнаць на пашу казу. Баба цэлы дзень добра пасьціла й даглядала казу. Баба рвала маладзенькую травіцу й давала казе, ганяла яе да крыніцы паіць. А калі вечарам яна прагнала казу дамоў, дык дзед выйшаў на панадворак ды пытае ў казы:

— Козачка-рожачка, ці піла ты ці ела?
— Не, дзедзька-лябедзька, ні піла я ні ела!
Бегла праз кладачку, глынула вады капачку!
Бегла праз масток, ухапіла кляновы лісток!
Гэтым і жыла дзянёк! — адказала каза.

Дзед абабіў бабу кіем ды прагнаў яе з хаты.

На пяты дзень дзед надзеў жончын андарак і шнуроўку, а на галаву закруціў хустку ды сам пагнаў пасьціць казу. Ён цэлы дзень добра пасьціў казу ды ганяў яе да крыніцы паіць. А калі вечарам прагнаў яе дамоў, дык хутка пашоў у хату, ськінуў жончын андарак, шнуроўку, хустку ды адзеўся ў сваю вопратку. Ён вышаў на двор дый пытае ў казы:

— Козачка-рожачка, ці піла ты ці ела?

— Не, дзедзька-лябедзька, ні піла я ні ела!

Бегла праз кладачку, глынула вады капачку!

Бегла праз масток, ухапіла кляновы лісток!

Гэтым і жыла дзянёк! — адказала каза.

Дзед разгневаўся на казу ды хацеў яе кіем абабіць, што праз яе ману ён пакараў сваю сям'ю. Дзед схапіўся за кій, а каза калі затупае нагамі, калі закрычыць:

— Тапу, тапу нагамі!

Збаду цябе рагамі!

Ножкамі затапчу!

Хвосьцікам замяту!

Каза калі ўдарыла дзеда рагамі ў калені, дык дзед абваліўся. Дзед схапіў нож ды наважыў казу зарэзаць на мяса. Ён пачаў казу рэзаць. Каза абвалілася ды прыкінулася няжывой. Дзед падумаў, што каза ўжо зарэзана. Ён пачаў з казы зьдзіраць скуру. Дзед садраў скуру з аднаго боку ды стаў яе пераварачаваць на другі бок. А каза калі ўскоча ды калі пабежыць у лес, дык дзед ня згледзіў, дзе яна схавалася. Каза ў лесе спаткалася з ваўком дый просіць яго:

— А воўча-браце, ратуй мяне, бо чалавек хацеў мяне зарэзаць.

— А хто-ж ты будзеш, што мне братам называеш? — пытае воўк.

— Я каза-недарэза,

Паўбока аблуплена,

За тры ґрошы куплена, — адказала каза.

— Калі-ж ты каза-недарэза, дык я дарэжу, — сказаў воўк.

Воўк задушыў казу ды зьеў.

80 МУЗЫКА

Быў адзін музыка. Яшчэ хлопчыкам будучы пасе валы ці коні, зрабіць з лазы дудачку ды як зайграе, дык валы пакінуць пасціцца, разьвесяць вушы ды слухаюць. А ў лесе птушкі прыціхнуць, нават жабы ня крумкаюць. А як павядзе коні на начлег — вясна, ночы цёплыя, аж парыць. Хлопцы й дзяўчаты папрыводзяць коні ў дубраву з усяго сяла, дурэюць, сьмяюцца, песьні пяюць. А музыка як зайграе на сваей дудачцы, дык адразу ўсе прыціхнуць. Вось ім здаецца, што нейкая слодыч ім уліваецца ў сэрца, а нейкая сіла схапіла за плечы ды нясе ўсё ўгору ды ўгору да ясных зораў у чыстае неба, у чыстае, сіняе, шырокае неба. Сядзяць яны, нічога ня думаюць, забыліся, што рукі ды ногі баляць ад цяжкай работы. Сядзяць ды ўсё слухаюць. І хацелася-б ім сядзець усё жыцьцё ды ўсё слухаць, як іграе музыка. Вось ён замаўчыць. Але ніхто ня сьмее паварушыцца, каб ня спужаць таго голасу, што рэхай рассыпаецца па дубраве, па лесе ды ладымаецца ў самае неба.

Але вось зайграе музыка жаласьліва, і заплача й лес і дубрава, Набяжыць хмарка, і зь неба сьлёзкі так і паліюцца. Ідуць позна да гасподы мужчыны й бабы, учуюць тую музыку, стануць слухаюць, плачуць, вос усё горкае жыцьцё перад вачыма стане, і так іх апануе жаль, што й мужы старыя барадатыя мужы, плачуць,як бабы над нябошчыкам. Але вось па нямалым часе, музыка ад жаласьлівага на вясёлае зьверне. Пакідаюць мужчыны й бабы граблі, косы, сярпы, букаткі, возьмуцца ў бокі й давай скакаць. Скачуць малыя дзеці, скачуць коні, скачуць кусты ды лес, скачуць зоркі, скачуць хмаркі, усё скача ды сьмяецца.

Вось такі быў музыка чараўнік: што захоча, тое ён з сэрцам зробіць.

81 РЫМАЎШЧЫНА (лягэнда)

Аднаго разу вучні з настаўнікам ішлі да гаю на пагулянку. Яны спыніліся адпачыць на вялікім лагу ля крынічкі. Гэта крынічка выцякала з-пад вялізнага каменя. Некатарыя хлопцы ўзьлезьлі на гэты камень і паклаліся на ім як на печы.

— Як гэта мясьціна завецца? — пытае настаўнік.

— Рымаўшчына, — адказала некалькі дзяцей.

— А чаму яна завецца Рымаўшчына? — пытае узноў настаўнік.

— Гэтак усе старыя людзі завуць, — сказаў Цятрусь.

— А мой дзед казаў, што тутка некалі даўна нейкі Рымар жыў, дык таму гэту мясьціну й завуць Рымаўшчына, — адказаў Міхась.

— А можа табе твой дзед нешта апавядаў аб тым Рымару, дык можа-б ты нам расказаў тое дзедава апавяданьне? — запытаў настаўнік у Міхася.

— Так. Дзед яшчэ шмат апавядаў аб тым Рымару, і я ўсё тое магу расказаць, але, каб вучні мяне не перабівалі, — сказаў Міхась і стаў апавядаць:

***

Даўна, надта даўна людзі жылі рэдка, а лясоў было шмат. Усюды быў лес і лес. Гэтта, дзе гэта крынічка, была вялізная крыніца, а зь яе выплывала шмат вады. Тая вада была запярэчана грэбляй поперак логу, дык тут было вялікае й глыбокае возера. Ля возера быў млын. А там далей, дзе той курган, была кузьня, бо яшчэ й цяпер там ёсць перапаленае каменьне, гліна й вугальле. Гаспадаром таго млыну й кузьні быў Рымар. Ён ня

толькі малоў збожжа ў млыне й выраблаў у кузьні розныя зялезныя рэчы, але яшчэ ён умеў варажыць і чараваць. Ён мог чалавека перавярнуць у ваўка ці іншага зьвера, або чалавека перавярнуць у камень.

У гэтага Рымара чароўніка было двое дзяцей — хлопчык і дзяўчынка. Рымаравы дзеці купаліся ў тым возеры й патапіліся. Рымару было шкода сваіх дзяцей. Ён надта разьгневаўся на тое возера й пракляў яго. Рымар ў тую вялізную крыніцу ўкінуў засмаленую смалой зачараваную шчэтку й накрыў яе зачараванай скаварадой. А каб іншы чараўнік ня зьняў чараў з тей заклятай шчэткі й скаварады ды ня выкінуў іх з крыніцы, дык ён сам сеў на тую шчэтку накрытую скаварадой і перавярнуўся во ў гэты вялізны камень і прыціснуў тую шчэтку й скавараду. Пасьля таго, нястала ні тэй вялізнай крыніцы ні таго вялікага й глыбокага возера. Лог стаў роўны, як скаварада, ды парос густой травой, як шчэтка. Але-ж памяць засталася ў тутэйшых людзей аб тэй вялікай крыніцы ды аб тым вялікім і глыбокім возеры ды аб чараўніку Рымару. Усё-ж тутэйшыя старыя людзі шкадуюць тэй крыніцы й таго вялікага й глыбокага возера ды спадзяюцца, што яны адновяцца.

***

Праз шмат гадоў пасьля заняпаду тэй крыніцы й возера прышоў да тутэйшых людзей іншы чараўнік. Ён сказаў, што можа зьняць чары чараўніка Рымара й аднавіць крыніцу й возера. Для гэтага патрэбна сабраць дванаццаць дзяцюкоў - асілкаў і дванаццаць дужых жарабкоў. Тыя дзяцюкі

й жарабкі адвернуць той вялікі камень, а ён зьніме чары з тэй заклятай шчэткі й скаварады, дык гэткім чынам адновіцца крыніца й возера. Але пакуль аднаўлаць крыніцу й возера, дык трэба выселіць з папярэчнай вуліцы іхнай вёскі людзей, бо на тым месцы мае праявіцца вялікая рэка. Тыя людзі пашкадавалі сваіх хатаў і сялібаў, дык да гэтага часу засталіся ня адноўленыя крыніца й возера.

— Ну, ці добрае апавяданьне, — пытае настаўнік.

— Надта цікава, — кажа Ганна. — Мы-б яшчэ слухалі.

***

— А можа яшчэ хто нешта ведае аб гэтай Рымаўшчыне? — пытае настўнік.

— Я ведаю. Мне бабулька казала, — адазвалася Марылька.

— Ну, дык раскажы нам тое, што табе бабулька казала? — сказаў настаўнік.

Марылька пачала апавядаць:

Мая бабулька ўсё тое казала, што казаў і Міхась, але Міхась ня ўсё расказаў аб крыніцы. Мая бабулька казала, што тая крыніца была ня звычайная крыніца. Яна была бяздонная крыніца: крыніца - вакно. У ей вада круцілася й хвалявалася, як у віры ў паводку. А з гэтай бяздоннай крыніцы былі падзямельныя лёхі да бяздонных віроў вялікіх рэкаў, да дзікіх вазёраў і да гэткіх самых бяздонных крыніцаў - вокнаў. Калі бывала казянё падойдзе да гэтай крыніцы - вакна, каб вады на-

піцца, дык нейкая пачвара высуне сваю страшную ляпу, а казянё проста й ляцела ў гэту страшную ляпу. Казянё толькі замякеча, і яго няма — яно гінула.

Бабулька й яшчэ казала, што ў гэтай бяздоннай крыніцы жыў вадзянік. Сюды ў канцы лета з палёў і лясоў зьбіраліся русалкі зімаваць.

***

Калі Марылька спыніла гутарку, дык дзеці між сабой сталі перашоптавацца. А настаўнік зьвярнуўся да Марылі:

— Тут дзеці ня ведаюць, што гэта такое — Вадзянік, і што такое — русалкі. Можа-б ты нам сказала што аб іх, калі ведаеш?

— Ведаю, — сказала Марылька. — Вадзянік — гэта пачвара падобная да чалавека, але на нагах не ступні, але бычыныя капыты. На руках на пальцах не пазногсі, але зьвярыныя капцюры. Усё ягонае цела, галава й твар абросшы доўгай касматай поўсьцю. Ён улетку й зімой сядзіць у ціне ў бяздонных вірох вялікіх рэкаў, у вазёрах ды ў бяздонных крыніцах - вокнах.

Русалкі — гэта істоты - здані ў выглядзе маладых прыгожых дзяўчат з прыгожымі доўгімі валасамі. Вясной, калі загрыміць першы гром, дык русалкі выскакваюць з вады ды разыходзяцца па лясох, палёх і гаёх. У месячную ноч яны ў гаёх на бярозавых галінках кальшуцца й прыгожа пяюць. Калі-б хто да іх адважыўся падыйсьці, дыкбы яны яго зашчакаталі на сьмерць. Русалкі летам ходзяць па полі між збожжа, а калі дзе знайдуць сьпячага чалавека. дык зашчакочуць на сьмерць.

Калі на канцы лета загрыміць апошні гром, дык русалкі з палёў, гаёў і лясоў зьбіраюцца да віроў вялікіх рэкаў, да вазёраў, да вялікіх крыніцаў-вокнаў і там сядзяць да наступнай вясны да першага грому.

Гэта Марыльчына апапяданьне яшчэ болей зацікавіла дзяцей. Яны ідучы да гаю гаварылі між сабой аб тэй страшнай пачвары, што сядзела ў крыніцы-вакне, што казнятаў хапала ду аб вадзяніку й русалках.

ЗАГАДКІ

1. А што бяжыць бяз повада?
   А што гарыць бяз полымя?
   А што плача бяз сьлёз?
2. Без вакон, без дзьвярэй
   Поўна хатка людзей.
3. Ходзе пан па страсе,
   Стаіць на аднэй назе.
   Жабы скачуць, уцякаюць,
   Калі яго спатыкаюць.
4. Чырвоны цьвік да зямлі прынік.
5. Чырвоны колер, вінны смак,
   Каменнае сэрца. Што гэта так?
6. Чырвоны дзедзя па жэрдзі едзе.
7. Ехала сушка у сямі кажушках
   Хто забача, дык заплача.
8. Еду, еду: ні дарогі ні сьледу.
   Шастом паганяю, на сьмерць паглядаю.
9. Едзе пані ў белым жупані.
   Перад ей паненкі паськідалі сукенкі.

10. Едзе пані ў чырвоным жупані,
Хто забача, той заплача.
11. Ішло хлопцаў дваццаць пяць.
Пасьля зімы сьляды знаць.
12. Каля ямы ўсе зь кіямі.
13. Коціцца кадушачка: ні зьвер ні пташачка.
14. Конік сталёвы, хвасток ляновы.
15. Круць-верць: у чарапку сьмерць.
16. Крута-віта. Хто адгадае: бочку жыта.
17. Ляціць, як пава, кладзецца, як пані.
18. Лаціць бяз крыл — у гадзіну сто міль.
19. Лаціць птах праз божы дах і крыўдзіцца:
Чаму мая праца гарыць?
20. Ляціць выe, сядзе рые.
21. Ляцеў кулітар. Сеў на растапытар.
Пытаецца ў кохаўкі: — Дзе твае пырхаўкі?
22. Ляжыць калода цераз балота:
Ня гніе і ня сохне.
23. Ляжыць Рася расьцягняся.
А як устане, дык і неба дастане.
24. Матка таўстуха, дачка цягуха,
А сын перабор паляцеў на двор.
25. Пад прышечкам грубяжы,
Хто ведае не кажы.
26. Паміж дубінкі, паміж ляшчынкі
Вісіць кончык скурашынкі.
27. Паненка тонка грыміць звонка.
28. Пані ў каморы, косы на дворы.
29. Поўна бочачка віна: нігдзе дзірачкі няма.
30. Поўна бочачка круп, а на версе струп.

31. Поўны падпечык белых авечак.
32. Сем дзён — маладзён.
33. Сем варот у вадзін гарод.
34. Стаіць бычок — абсмалены бачок.
35. Стаіць дзед нізак, а на ім сто рызак.
36. Стары дзедзя на дрэве едзе,
Шастом паганяе, на сьмерць паглядае.
37. Шах-мах, пад прыпечак, бах!
38. Што ў лазе на курынай назе?
39. У лесе радзілася, а на вясельлі згадзілася.
40. У лесе сьцята, у камору ўзята,
А возьмеш у рукі, дык загавора.
41. Вісіць сіта з злота літа,
А хто гляне, дык заплача.
42. Воўны клачок, дрэва сучок, саломы пучок,
Рэмяню шмацінка: вось і цэлая снасьцінка.

Разгадкі

1. Вада, золата, іскрыпка.
2. Гарбуз зь зярнятамі.
3. Бусел.
4. Бурак на градзе.
5. Вішня (Чарэшня).
6. Агонь па лучынцы.
7. Цыбуля.
8. Плытнік плыве на плыце.
9. Зіма. Дрэвы. Лісьце.
10. Цыбуля.
11. У баране — 25 зубоў.
12. Каля міскі з лыжкамі.
13. Яйцо.
14. Іголка зь ніткай.
15. Стрэльба.
16. Клубок нітак.
17. Сьнег.
18. Вецер.
19. Пчала. Бажніца. Воск.
20. Жук.
21. Кулітар — ястраб. Растапытар — дазяроды. Кохаўка — курыца. Пырхаўкі — піськлятьі.

22. Язык у роце.
23. Дарога.
24. Печ. Комін. Дым.
25. Пацеркі пад барадой (на шыі).
26. Гуж і прывязкі ў цэпе.
27. Стрэльба.
28. Моркава на градзе.
29. Яйцо.
30. Макаўка.
31. Зубы ў роце.
32. Месяц-маладзік.
33. Галава чалавека.
34. Засланка ад печы.
35. Качан капусты на градзе.
36. Плытнік едзе на плыце.
37. Мятла (венік).
38. Грыб.
39. Іскрышка.
40. Іскрышка.
41. Сонца.
42. Хамут.

---

[1]) Što takoje *magała*, dla nas pakul što nieviadoma. Ale-ž, jak kaža naša prykazka: "Ź pieśni słova nie vykidajuć". Treba prypuskać, što heta słova dalokaj staraśvietčyny, jakoje ŭvasablaje jistotu-ducha, apiakunku małych dzietak.

[2]) *Šuša* abo *šušała* — heta ŭvasableńnie lasnoha šumu, jakim strašuć dziaciej, kab nočču nie havaryli, nie płakali, ale kab cicha lažali dy spali, prykładam: "Cichu, Antoška, ato šuša zabiare!"

[3]) Kali ŭ dziciačych pieśniach ci prykazach uspaminajecca jimia dziciaci, dyk heta jimia prykładnaje. Zamiesta jaho, treba ŭžyvać jimia taho dziciaci, kamu piajecca piesieńka ci da kaho źviartajucca z hutarkaj.